**ГРО́ЗА** (Groza) Аляксандр Караль (30.6.1807, в. Закрынічча Вінніцкай вобл., Украіна — 3.11.1875), польскі паэт, празаік, драматург; прадстаўнік т.зв. «украінскай школы» польск. рамантызму. Вучыўся ў Віленскім і Дэрпцкім ун-тах. У 1837—41 рэдагаваў і выдаваў у Вільні штогадовы альманах «Rusalka» («Русалка»). Пісаў вершы і паэмы на гіст. («Магілы») і фалькл. тэматыку («Помста Чорнага Бога», «Аліна» і інш.). Выкарыстоўваў і творча асэнсоўваў бел. фальклор («Марына. Беларуская аповесць», «Глухое возера. Беларуская аповесць»). Аўтар паэт. зб. «Паэзія» (1835), паэм «Канёўскі стараста» (1836), «Сарока» (1838), «Пра памерлыя душы» (1848), «Марцін» (1849), «Смяцінскі» (1860), драмы «Грыцъ» (1858) і інш. У альманаху «Rubon» («Рубон») змясціў тэксты бел. нар. песень, этнаграф. матэрыялы.

*В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова